*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 35 (466) | Серада, 29 лістапада 1961 г. | Цана 1 кап.

## *Знаёмцеся:* Канстанцін Філіповіч



*КАМСАМОЛЬСКІ сход III курса матэматычнага факультэта праходзіў вельмі бурна. Моладзь абмяркоўвала надзённыя пытанні: «Аб дысцыпліне, паспяховасці і адносінах да грамадскай работы». Хіба ж можна застацца абыякавым, калі размова ідзе аб тым, што хвалюе кожнага? Вядома, не. Таму і не дзіва, што выступаў на гэтым сходзе амаль кожны.*

*Асабліва дасталося Яўгену Калашнікаву. Таварышы прынцыпова крытыкавалі яго за пропускі заняткаў, за дрэнную паспяховасць.*

*Студэнткам Першыц і Харавай давялося пачырванець, бо іх крытыкавалі за дрэнную дысцыпліну. Шмат хто з камсамольцаў апускаў вочы і адчуваў, як загараюцца кончыкі вушэй—крытыка была моцнай і калючай.*

*У тым, што сход атрымаўся такім дзейсным, немалая заслуга належыць сакратару камсамольскага бюро курса Канстанціну Філіповічу. Аб ім і хочацца расказаць.*

*У 1959 годзе Канстанцін закончыў Заслаўскую сярэднюю школу з сярэбраным медалем і адразу ж паступіў ва універсітэт. Адчувалася добрая падрыхтоўка юнака ў сярэдняй школе. З першага дня вучобы Канстанцін зарэкамендаваў сябе здольным і актыўным студэнтам, шчырым і бескарысным таварышам. А хутка выявілася і яшчэ адна рыса яго характару—сяброўская дапамога. Яна была неабходнай і вельмі своечасовай. Пётр Арлюкевіч прыйшоў ва універсітэт з вытворчасці. Юнак даўно не браўся за падручнік і яму неабходна было ўпарта працаваць. У першым семестры Пётр атрымаў «хвост».*

*Канстанцін цвёрда рашыў дапамагчы таварышу. І яго праца не прапала дарэмна. Уладзімір Ахрамейка, Міхаіл Арцёмчык і іншыя таксама шчыра дзякуюць Канстанціну за яго шчырую дапамогу.*

*Разам з тым Канстанцін удзельнічае і ў рабоце СНТ. Яго праца «Асобныя пункты ураўненняў Якобі» была допушчана да універсітэцкага агляду і атрымала добрую адзнаку.*

*Чулы таварыш, спартсмен, выдатнік вучобы Канстанцін Філіповіч карыстаецца заслужаным аўтарытэтам і павагаю не толькі сярод аднакурснікаў, але і на ўсім факультэце.*

**Э. СМОЛЬСКІ,**
**член рэдкалегіі насценгазеты «Рашым любую задачу».**
**Фота Л. КУЗЬМІЦКАГА.**

# ПРЫВІТАННЕ ВАМ, ПАСЛАНЦЫ ГЕРАІЧНАЙ КУБЫ!

Далёкая гераічная Куба, зялёны востраў свабоды ў Карыбскім моры! Мы лавілі весткі аб цяжкай барацьбе народа ў гарах Сьера Маэстра. Да нас даляцелі адгалоскі баёў у заліве Качынас, калі банды наемных забойцаў узнялі руку на свабоду Кубы. Народ перамог, бо на яго баку праўда і падтрымка ўсіх сумленных людзей.

Куба будуе новае жыццё. А для гэтага ёй патрэбны спецыялісты — інжынеры, механізатары, будаўнікі. Многія з іх вучацца ў нашай краіне.

... Панядзелак, 27 лістапада. Поезд прыбудзе яшчэ праз гадзіну, але перон ужо запоўнілі сотні мінчан. Асабліва многа тут студэнтаў універсітэта. Мы з асаблівым хваляваннем чакаем дарагіх кубінскіх сяброў, бо яны будуць жыць і вучыцца побач з намі.

Марасіць дожджык, і тугі вецер развявае сцягі на франтоне вакзала. Нейкія неперадаваемыя мінуты чакання. І вось з-за паварота паказваецца поезд і, абдаўшы сабраўшыхся клубамі белай пары, спыняецца. З вагона выходзяць смуглявыя юнакі. Яны радасна ўсміхаюцца. Студэнты падносяць маладым кубінцам жывыя кветкі. Чуваць воклічы: «Віва Куба!», апладысменты...

На пероне вакзала адбыўся мітынг, які адкрыў прарэктар БДУ імя У. І. Леніна Аляксандр Якаўлевіч Малышаў.

Усхвалявана прагучэла выступленне студэнткі філалагічнага факультэта Лілі Сілкінай.

—Усе нашы студэнты,—сказала яна,—бесконца рады сустракаць сёння вас, пасланцаў далёкай Кубы, на гасціннай беларускай зямлі і працягнуць вам шчырыя сяброўскія рукі. Нашы сэрцы заўсёды адкрыты для дарагіх сяброў!

Ад імя моладзі Мінска маладых пасланцаў гераічнага вострава свабоды павіншаваў сакратар гаркома камсамола Тадэуш Сенюць.

Горача сустрэлі студэнты выступленне прадстаўніка моладзі Кубы Эстэбо Альфонсо.

Мітынг закончаны. У святле пражэктараў іскрацца ніткі дажджу, але настрой ва ўсіх бадзёры, прыўзняты, святочны. Гучаць словы, якія кожны сёння разумее без перакладчыка:

—Віва Куба!

—Віва Куба лібрэ!

## Студэнты БДУ рады прыняць вас у сваю сям'ю, дарагія сябры!

## ІДЗЕ




Выступае Мая Маркевіч

**—Шмат добрых студэнтаў у нашай групе,—гаворыць нам выкладчык гісторыі КПСС Мікіта Ермалаевіч Гракаў.—Вось, напрыклад, студэнткі Дычкоўская, Маркевіч, Магілянец, Карунова, Асіпчык. З душой, што называецца, адносяцца да справы...**

**У біёлагаў другога курса пачаўся семінар. Тэма: «Барацьба Камуністычнай партыі за ажыццяўленне ленінскага плана сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны».**

**Па пытанню аб прынцыповых адрозненнях сацыялістычнай індустрыялізацыі ад капіталістычнай вытворчасці выступаючых знайшлося нямала. Першай выступае Нэля Войцік.**

**У краінах капітала, гаворыць яна, развіццё цяжкай прамысловасці пачынаецца на базе ўжо развітай лёгкай. У нас жа галоўная ўвага ўдзяляецца развіццю цяжкай прамысловасці. Мэта вытворчасці капіталістаў—нажыва, наша мэта—хутчэй пабудаваць камунізм.**

**Нэля кожны довад характарызуе канкрэтнымі прыкладамі.**

**Таня Магілянец заўважае, што пытанне асветлена не да канца. Яна грунтоўна расказвае аб планавым развіцці сацыялістычнай прамысловасці, аб росце супярэчнасцей у краінах капіталістычнай сістэмы.**

**Аб развіцці сацыялістычнай індустрыі ў першыя гады савецкай улады, аб цяжкасцях індустрыялізацыі павінна была расказаць Валя Мыцько. Але яна гэтага пытання добра не ведала. Больш змястоўна асвятляе пытанне Таня Асіпчык. Яна гаворыць аб нізкім тэхнічным узроўні вытворчасці і адсталасці царскай Расіі, аб адсутнасці ў народнай гаспадарцы кваліфікаваных рабочых, інжынераў, тэхнікаў, аб злоўжываннях буржуазных «спяцоў».**

**—Дзякуючы правільнай і паслядоўнай лініі партыі ў той час былі разбіты антыпартыйныя фракцыйныя групоўкі апазіцыянераў,—гаворыць Мая Маркевіч. Яна звязвае свой адказ з сучаснасцю і гаворыць аб разгроме антыпартыйнай групы фракцыянераў Молатава, Маленкова, Кагановіча і іншых, якія выступілі супраць генеральнай лініі Камуністычнай партыі.**

**Мікіта Ермалаевіч заўважае, што адказ няпоўны. Дапаўняюць Маю Маркевіч Ала Вінар і Нэля Войцік.**

**Празвінеў званок, але размова працягваецца на калідоры. Дзяўчаты, хлопцаў няма ў групе, абступілі Мікіту Ермалаевіча Гракава, прасілі даць адказы на хвалюючыя пытанні, выказвалі свае думкі.**

**Так прайшоў семінар па гісторыі КПСС у адной з груп другога курса біяфака. Прайшоў ён жыва, цікава, у дзелавой абстаноўцы.** **П. ЕЛЕЦ.**



Дыскусія працягваецца і на калідоры.

## Разгледжаны важныя пытанні

24 лістапада адбылося пасяджэнне Вучонага Савета, на якім абмеркаваны важнейшыя пытанні, што стаяць перад калектывам універсітэта.

З дакладам «Аб вывучэнні матэрыялаў XXII з'езда КПСС» выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў.

Вучоны Савет зацвердзіў план навукова-даследчых работ на наступны год па кафедральнай тэматыцы. Даклад па гэтаму пытанню зрабіў прарэктар па навуковай рабоце Г. А. Павецьеў.

## Юбілей святкуем урачыста

**Ідуць апошнія падрыхтаванні да святкавання 40-годдзя старэйшай навучальнай установы рэспублікі.**

**Цікавымі і змястоўнымі будуць выступленні гурткоў мастацкай самадзейнасці. Аркестр народных інструментаў, танцавальны гурток, харавая капэла, эстрадны аркестр універсітэта выступяць з вялікімі разнастайнымі рэпертуарамі на вечарах адпачынку. Урачысты вечар—канцэрт рыхтуюць студэнты фізічнага факультэта, дзе нядаўна створаны ансамбль песні і танца. Кіруе ансамблем студэнт трэцяга курса Іван Грыб.**

**На філфаку ў праграму канцэрта ўключан вялікі сатырычны аддзел, зместам якога з'яўляюцца розныя бакі студэнцкага жыцця. Аб гісторыі біялагічнага факультэта раскажа стэнд, які рыхтуюць студэнты біяфака.**

**На хімічным факультэце хутка адбудзецца пасяджэнне вучонага савета, дзе выступяць акадэмік Ярмоленка і выхаванец універсітэта дэкан хімфака Цішчанка.**

Альбін МАКАРЭВІЧ.

## *XXI прафсаюзная канферэнцыя*

*У нядзелю адбылася чарговая прафсаюзная канферэнцыя. Прасторную аўдыторыю ў біякорпусе запоўнілі лепшыя студэнты і прафсаюзныя актывісты ўсіх факультэтаў. Перад прысутнымі выступіў старшыня прафсаюзнага камітэта універсітэта А. Цалко.*

# Нашы важнейшыя задачы

*—У праграме партыі адзначаецца, што ў час разгорнутага будаўніцтва камунізма значна павышаецца роля прафсаюзаў, як школы кіраўніцтва, гаспадарання, школы камунізма. У сувязі з гэтым перад нашай прафсаюзнай арганізацыяй паўстае рад новых задач, звязаных з падрыхтоўкай высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, — гаворыць дакладчык.*

*Далей ён гаворыць, што прайшоўшы час прафсаюзная арганізацыя універсітэта кіравалася рашэннямі партыйнай арганізацыі, рэктарата, вышэйстаячых прафсаюзных органаў і рашэннямі XX прафсаюзнай канферэнцыі. З чым жа мы падышлі да сённяшняй канферэнцыі?*

*Вынікі летняй экзаменацыйнай сесіі даюць магчымасць зрабіць вывад, што веданне праграмнага матэрыялу нашымі студэнтамі стала больш глыбокім, трывалым. Дзесяткі нашых студэнтаў з года ў год сумяшчаюць выдатную вучобу з актыўнай грамадскай работай. Гэта Макарэвіч, Атрошчанка (гістфак), Стрыжэвіч, Красней (філфак), Пазняк, Марук (матфак), Пятровіч, Рылюк (геафак) і многія іншыя. Але тыя поспехі, якія мы маем, не даюць нам права супакойвацца. Ёсць студэнты, якія атрымліваюць нездавальняючыя адзнакі, парушаюць вучэбную дысцыпліну.*

*Вопыт паказвае, што ў тых групах, дзе маецца згуртаваны калектыў, дзе добра працуе прафсаюзная арганізацыя, дзе пытанням вучобы ўдзяляецца паўсядзённая ўвага, дзе бязлітасны да парушальнікаў дысцыпліны, там і паспяховасць добрая і грамадскае жыццё б'е ключом. Гэта—першая група трэцяга курса юрфака (прафорг Дзіккіна), чацвёрты курс геафака (прафорг Пракаповіч).*

*Вядома, што больш за ўсё нездавальняючых адзнак на ўсіх факультэтах прыпадае на долю першых і другіх курсаў. Таму на ўсіх факультэтах былі праведзены вечары сустрэч першакурснікаў са старшакурснікамі, на якіх лепшыя студэнты і выкладчыкі расказалі аб правільнай арганізацыі рабочага дня, адпачынку. Вучэбна-навуковай камісіяй перад зімовай і летняй сесіямі былі арганізаваны кансультацыйныя пункты.*

*Дрэнна абстаяць справы з наведваннем лекцый, і першае месца займае філфак, дзе 590 студэнтаў прапусцілі 9100 вучэбных гадзін. Акадэмічныя камісіі вялі барацьбу з пропускамі, наладжваючы перыядычныя праверкі але гэтага аказалася недастаткова.*

*Трэба адзначыць, што вучэбныя планы маюць патрэбу ўдасканальвання. Трэба пазбегнуць перагрузкі студэнтаў. Калі на тыдні бывае 40—44 гадзіны заняткаў, то гэта ўжо ненармальная з'ява. Уводзяцца новыя прадметы, на асобныя дысцыпліны павялічваецца колькасць гадзін, а выкладчыкі нярэдка не перабудоўваюць сваю работу. На самастойныя заняткі часу не хапае.*

*Цяжка сабе ўявіць, што некаторыя студэнты прыродазнаўчых факультэтаў пры выхадзе з універсітэта не могуць граматна пісаць. Трэба ўвесці на ўсіх факультэтах вывучэнне рускай мовы. Будзе гэта на першых, ці на апошніх курсах, усё роўна.*

*Далей выкладчык гаворыць аб рабоце СНТ. Ва універсітэце маецца сорак навуковых гурткоў, дзе займаецца 435 студэнтаў. Гэта вельмі мала. Напісаныя студэнтамі навуковыя работы прадстаўляюць арыгінальныя тэарэтычныя ці эксперыментальныя даследаванні. З 114 работ, прадстаўленых на гарадскі агляд, 8 атрымалі першую і 11—другую катэгорыю.*

*За прайшоўшы час больш увагі было звернута на пытанні выхаваўчай і культурна-масавай работы. У мінулым годзе працаваў універсітэт культуры, які наведвала 700 чалавек. У гэтым годзе пачаў працаваць кіналекторый. Былі арганізаваны экскурсіі ў Маскву, Севастопаль, у Брэсцкую крэпасць і многія іншыя месцы нашай краіны. Шмат было вечароў адпачынку, культпаходаў, сустрэч і гэтак далей. У далейшым гэтым мерапрыемствам трэба ўдзяліць больш увагі.*

*Многа было сказана аб фактах амаральных паводзін асобных студэнтаў, за што апошнія былі выключаны з універсітэта. Прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў павінны павесці барацьбу з гэтымі з'явамі; трэба даходзіць да кожнага студэнта, ведаць, чым ён займаецца ў вольны час, з кім сябруе.*

*На фарміраванне поглядаў будучых спецыялістаў асабліва добра сказваецца сумяшчэнне вучобы і працы. У мінулым годзе прафсаюзная арганізацыя зрабіла вялікую работу па працоўнаму выхаванню студэнтаў. За гэты год студэнтамі адпрацавана сто тысяч гадзін на будаўніцтве галоўнага корпуса, на будоўлях роднага горада.*

*Вялікую дапамогу аказалі студэнты калгасам у час восеньскіх палявых работ. Імі адпрацавана 4 000 працадзён. Акрамя сельгасработ студэнты праводзілі значную культурна-масавую работу.*

*У рабоце прафкома пытанням быту студэнтаў удзялялася значная ўвага. Але тое, што было зроблена, недастаткова. Становішча ў інтэрнатах не ўсюды аднолькавае. На аглядзе-конкурсе інтэрнат № 4 заняў першае месца. Тут добра наладжана ўборка жылых пакояў, калідораў, добра наладжана дзяжурства пры ўваходзе ў інтэрнат. Студсавет стаў сапраўдным гаспадаром. Але ёсць і недахопы. Ленпакой не стаў месцам адпачынку, вучобы студэнтаў. Горш справы ў іншых інтэрнатах.*

*Прыклады амаральных учынкаў у інтэрнатах гавораць аб тым, што некаторыя выкладчыкі, адказныя за палітыка-выхаваўчую работу ў групах, не ведаюць, як «адчыніць» дзверы ў інтэрнаты. Неабходна, каб выкладчыкі часцей наведвалі сваіх студэнтаў, знаёміліся з іх запатрабаваннямі, бытам. Гэта не толькі дапаможа лепей весці выхаваўчую работу з кожным студэнтам, але і палепшыць увесь вучэбны працэс.*

*З пытаннем інтэрната непарыўна звязана пытанне назначэння стыпендыі. На гістарычным, геаграфічным, фізічным факультэтах гэта справа наладжана добра. Стыпендыяльная камісія ўлічвае матэрыяльнае становішча, удзел у грамадскім жыцці, паспяховасць кожнага студэнта.*

*Але маюцца выпадкі, калі стыпендыя размяркоўваецца дэканам факультэта. І атрымліваецца так, што студэнт не мае ні стыпендыі, ні месца ў інтэрнаце. Так адбылося са студэнткай першага курса хімфака Даравшэнка. Трэба, каб у далейшым гэтага не атрымлівалася.*

*Далей дакладчык адзначае, што студэнты універсітэта добра адпачылі ў лепшых санаторыях краіны, дамах адпачынку. Былі арганізаваны турысцка-альпінісцкія паходы, паездкі за мяжу; 226 студэнтаў адпачывалі ў спартыўна-аздараўленчым лагеры. На гэтыя мерапрыемствы са сродкаў прафсаюза было адпушчана 3900 рублёў.*

*Асобна спыняецца дакладчык на рабоце касы ўзаемадапамогі. Нядаўна ў ёй быў поўны развал работы. Вельмі многа студэнтаў злосна не хочуць плаціць задоўжанасць. Сярод іх Ананьеў, Кісялёў, Халецкі (юрфак), Сідараў, Зелянкоў (гістфак), Якубоўская, Нікалайчук (філфак), Мартыненка (біяфак). Неабходна прыняць дзейныя меры да гэтых студэнтаў.*

*У заключэнне тав. А. Цалко ахарактарызаваў актыўных прафгрупоргаў і пажадаў уноўвыбранаму прафкому поспехаў у рабоце, каб вырашыць тыя задачы, якія стаяць перад прафсаюзнай арганізацыяй.*

*Са справаздачнымі дакладамі выступілі Лашчынін (аб рабоце клуба) і Карніенка (аб рабоце рэвізійнай камісіі).*



**Мы паведамлялі ўжо аб новых экспанатах, якімі папоўніўся сёлета гістарычны музей БДУ.**

**НА ЗДЫМКУ: Цікавая знаходка! Студэнты аглядаюць старажытны сасуд.**

## Да сесіі—ЛІЧАНЫЯ ТЫДНІ

### *Чытаючы насценгазету*

Прагучэў званок. Вузкі калідор фізічнага корпуса запоўнілі юнакі і дзяўчаты. Увагу многіх студэнтаў прыцягнула насценная газета «За навуку».

— Хлопцы, пра нашу групу напісана!—пачуўся нечый голас.

Хутка ля газетнай вітрыны сабралася каля паўтара дзесятка чалавек. Адны ажыўлена разглядвалі фотаздымкі, другіх цікавіла карэспандэнцыя «На першым курсе», у якой расказвалася аб семінарскіх занятках на фізічным факультэце, аб падрыхтоўцы да зімовай сесіі.

Рэдкалегія насценнай газеты «За навуку» правільна зрабіла, што змясціла такі матэрыял. Чытаючы яго, міжволі задумваешся, а ці ўсё робіш ты, каб добра падрыхтавацца да экзаменаў, ці правільна сплانаваў свой час.

Галоўная задача, якая стаіць цяпер перад студэнтамі нашага універсітэта,—добра падрыхтавацца да зімовай сесіі. Задача ж рэдкалегій насценных газет—шырока асвятляць ход падрыхтоўкі да гэтай важнай падзеі, расказваць пра лепшых студэнтаў і крытыкаваць тых, хто не рыхтуецца да заняткаў, прапускае лекцыі.

На вялікі жаль, на старонках некаторых насценных газет не знойдзеш ніводнага радка на гэтую тэму. Возьмем, напрыклад, насценгазету хімічнага факультэта «Савецкі хімік» (рэдактар В. Сташонак). На першы погляд можна падумаць, што гэта фотавыстаўка: у газеце змешчана 19 фотаздымкаў, якія займаюць амаль тры чвэрці ўсёй газеты. Большасць фотаздымкаў зусім не звязаны з жыццём факультэта.

Многа месца адведзена ў газеце «сатыры і гумару». У прыватнасці, змешчана карыкатура на студэнтаў чацвертага курса. Але каго канкрэтна крытыкуе рэдкалегія і за што, невядома. Ад такой крытыкі карысці мала.

Слаба асвятляе вучобу студэнтаў насценная газета «Студент истфака». Амаль усю газету займаюць чатыры вялікія карэспандэнцыі. Толькі ў адной з іх некалькімі словамі ўспамінаецца аб набліжэнні экзаменаў.

Да зімовай сессіі засталіся лічаныя тыдні. Насценныя газеты не павінны стаяць убаку ад важнай і адказнай справы асвятлення падрыхтоўкі да зімовых экзаменаў.

**М. ЯКІМЧЫК.**

## Аб дружбе студэнцкай

«Свет і людзі»—пад такім загалоўкам інтэрнацыянальны клуб нашага універсітэта выпусціў свой першы ілюстраваны бюлетэнь.

У змешчаных матэрыялах студэнты расказваюць аб дружбе і сувязях с моладдзю розных краін свету. Ларыса Канюшка, старшыня клуба, напрыклад, расказвае аб тым, што інтэрнацыянальны клуб, створаны па ініцыятыве камітэта камсамола, праводзіць вялікую работу па наладжванню сувязей з зарубежнай моладдзю.

Цікавы артыкул напісаў студэнт 4 курса філфака Васіль Сакоўскі. Ён называецца «Рок акадэміцкі» («Год акадэмічны»). У бюлетэні змешчаны таксама матэрыялы аб Ліване, аб 250-годдзі з дня нараджэння сусветна вядомага рускага вучонага Міхаіла Васільевіча Ламаносава. Ёсць многа здымкаў.

Цікава афармлены бюлетэнь прыцягвае ўвагу чытачоў.

**М. ШАРУБА.**

# ЗАЎВАГІ ДЭЛЕГАТАЎ

### *Я СУПРАЦЬ УРАЎНІЛАЎКІ*

*Шмат розных студэнтаў займаецца ва універсітэце. Але пры выхадзе з яго ўсе размяркоўваюцца на работу аднолькава. Я супраць гэтага. Мэтазгодна пераняць вопыт Растоўскага універсітэта, дзе ёсць працоўная кніжка студэнта. У ёй адзначаецца, як студэнт удзельнічаў у грамадскім жыцці, ці займаўся навуковай работай, запісваюцца падзякі і спагнанні.*

*СЛАБОДЧЫК, старшыня культмасавай камісіі.*

### *ПАТРЭБЕН ЦЕСНЫ КАНТАКТ*

*Прафсаюзная арганізацыя займаецца толькі інтэрнатамі і стыпендыяй, а ўсю астатнюю работу выконвае камсамольская арганізацыя. Патрэбен цесны кантакт паміж усімі камісіямі камсамольскага і прафсаюзнага камітэта. Я прапаную складаць планы работы сумесна.*

*А. СТРЫЖЭВІЧ, сакратар камсамольскай арганізацыі філфака.*

### *НЕАБХОДНА ЗААХВОЧВАННЕ*

*Трэба прымяніць меру заахвочвання для ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, узнагароджваць іх граматамі і прэміямі, пасылаць калектывы ў розныя гарады, наладжваць сустрэчы з рабочымі і калгаснікамі.*

*ПАРМОН, член праўлення клуба.*

### *СПОРТ І ДОБРЫ АПЕТЫТ*

*Не адзін раз наведаў я нашу сталовую. Не раз заўважаў, што блюды прыгатаваны вельмі дрэнна. Але студэнты не звяртаюць на гэта ўвагі. Больш патрабавальнымі павінны быць студэнты да якасці ежы, часцей правяраць работу сталовай. Вядома, што добрая ежа—гэта выдатная вучоба, добры настрой, моцнае здароўе, а таксама і вялікі спорт.*

*М. ШЭЙНЕМАН,*
*старшыня праўлення спортклуба.*

### *ГЕНІЙ—ГЭТА ПРАЦА*

*Студэнт павінен атрымаць глыбокія веды ва універсітэце. Выкладчыкі могуць толькі паказаць галоўныя шляхі ў навуку, астатняе залежыць ад студэнтаў. Студэнт павінен навучыцца рацыянальна выкарыстоўваць час, шмат працаваць над сабой. Геній—гэта перш за ўсё праца, працаздольнасць. Толькі ў такім выпадку можна дабіцца поспехаў.*

*А. Н. СЕЎЧАНКА,*
*рэктар універсітэта.*

### *ВЫХАД ЁСЦЬ*

*Калі калектыў мастацкай самадзейнасці хоча выехаць з канцэртам у іншыя гарады, то адказ адзін: няма транспарту. А транспарт ёсць. Кожны інстытут мае свой аўтобус. Чаму б, напрыклад, нам не ўзяць у іх на сёння, а ў другі раз даць другому інстытуту?*

*Г. ГЕРАСІМЕНКА,*
*выкладчык кафедры гісторыі КПСС.*

□

*Абран новы склад прафкома БДУ. Старшынёй выбран Аляксандр Цалко (філфак, 4 курс).*

ЗАМЕТКІ НА ПАЛЯХ

## Грубашэрсная лірыка

*Насценгазета «Савецкі юрыст»—вялікі гумарыст. Сапраўды, пачытайце толькі, што яна змясціла:*

**Чтоб не бритый, нечесанный,**
**Рядом молча сидел**
**И глазами влюблёнными**
**На луну не глядел.**
**Чтоб щеками колючими**
**Руки все исколол...»**

*і гэтак далей.*

*Не падумайце толькі, што гэта гумарыстычны верш. Гэта «лірыка» невядомага аўтара, які так закаханы ў няголенага, што забыў нават паставіць сваё прозвішча пад вершам. Напэўна, гэта дзяўчына... Мне захацелася невялікім вершыкам крыху дапоўніць аўтара.*

**Муж небритый, нечесанный—**
**Это мой идеал,**
**Чтоб ворон он, как чучело,**
**В огороде пугал.**

**Я. КАЗЮКІН.**

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

Наш адрас:

Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31. Тэлефон 2-07-19.

Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР.

АТ 05401 Зак. 2432